супрацоўнікаў выклікала жах. Боязь машыны пастулова пераадольвалася, дзякуючы ўсведамленню таго, што яна сапраўды аблягчае працу. І ў хуткім часе амаль усе валодалі асновамі працы на ЭВМ. На жаль, былі і тыя, хто ўсё ж такі не змог пераадолець гэта.

Цяжкасці закранулі і самую распрацоўку базы камплектавання, перш за ўсё базу даных "Рэгістрацыя дакументаў". Праграмісты цікавіліся тэхналагічнымі працэсамі і, зыходзячы з прапаноў супрацоўнікаў, пісалі сваю версію праграм.

**Ю.Г.Болатава,**
*аспірантка кафедры сацыялогіі і культуразнаўства*

## МАСТАЦКАЕ АФАРМЛЕННЕ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ

Пры разглядзе сучаснай беларускай кнігі звернем увагу на кнігу як прадмет мастацтва. У беларускім мастацтве кнігі склаўся традыцыйны погляд на мастацкае афармленне, калі тэкст суправаджаецца ілюструючай яго візуальнай інфармацыяй. Яна можа дакладна перадаваць змест папулярнымі сродкамі, тлумачыць яго ці параджаць шэраг асацыяцый. На выставе айчынных мастакоў-ілюстратараў можна было выдзеліць тры асноўныя напрамкі творчасці, якія ўмоўна назавём традыцыйным, класічным і авангардным.

Да традыцыйнага мы аднеслі тыя работы, у якіх пераважае рэалістычная манера адлюстравання прадметаў і з'яў. Гэта ілюстрацыі дзіцячай літаратуры, якія павінны быць яркімі, маляўнічымі і разам з тым простымі і зразумелымі, перадаваць дакладныя, трапныя характарыстыкі герояў. У якасці прыкладу згадаем работы Ю.Алісіевіч да казак К.Чукоўскага, В.Макаранкі да "Рабінзона Круза" Д.Дэфо, А.Кажаноўскага да "Маленькай Бабы Ягі" О.Пройслера, М.Рыжага да

"Верабейкі" М.Горкага, В.Гардзіёнак-Кірэевай да "Снежнай каралевы" Г.-Х.Андэрсэна і В.Крупянковай да "Рэпкі". Даўно працуюць з дзіцячай кнігай К.Ракіцкі (ілюстрацыі да гістарычнай кнігі С.Агеева "Быль набату"), Г.Хінко-Янушкевіч (ілюстрацыі да твораў М.Скоблы "Камень-перунок", Р.Барадуліна "Мішка, Грышка і Шчыпай...", а таксама часопіса "Бярозка"), Н.Паплаўская (ілюстрацыі да казкі "Козачка"), Т.Беразенская (ілюстрацыі да кнігі "Беларускія народныя прымаўкі"). Пра апошнюю мастачку хацелася б сказаць асобна. Таццяна Беразенская — вядомы мастак-графік. Асабліва ёй удаецца ствараць і афармляць кнігі для самых маленькіх чытачоў. Яе малюнкі вельмі дэкаратыўныя. Мастачка ўмее трапна і выразна раскрыць змест тэксту, удала выкарыстоўвае фактуру і арнамент. Многія яе кнігі выходзілі на замежных мовах. Т.Беразенская — пастаянная ўдзельніца рэспубліканскіх і міжнародных выстаў, дыпламантка конкурсу "Мастацтва кнігі".

Да ілюстрацый, выкананых у вытанчаным класічным стылі, можна аднесці работы А.Каламіец да "Балад і рамансаў" А.Міцкевіча і Г.Кавалёвай да кнігі "У альбом" таксама А.Міцкевіча. Вельмі цікавае выданне "Чорцікавай казкі" ў афармленні Р.Сустава: у кожнай літары тэксту свой колер, выдатная архітэктоніка кнігі, выразна адчуваецца мелодыя радка. Усё гэта ў спалучэнні з малюнкамі стварае адзіную адметную і незабыўную тканіну кнігі. Спалучэнне традыцый і сучаснасці назіраецца ў ілюстрацыях Т.Шэлест да кнігі А.Міцкевіча "Ranek i wieczór", дзе асэнсавана беларуская культура ў цікавым сінтэзе сучаснасці і старажытных сімвалаў.

"Эксперыментальны" напрамак адчуваецца ў рабоце П.Татарнікава да "Выбранай паэзіі і прозы" Ул.Някляева, дзе суадносіны слова і ілюстрацыі ствараюць асаблівую ўнутрыкніжную прастору, якая выклікае пачуцці неабсяжнасці і свабоды. Цікавыя ілюстрацыі ў духу сюррэалізму выканаў А.Шычко да "Моцнага чарадзея". Малюнкі з каментарыямі Д.Прыхадоўскай магчыма можна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

было б аднесці да прымітывізму, але сваёй шчырасцю і дзіцячай непасрэднасцю яны абвяргаюць думкі аб якой-небудзь мастацкай школе. На наш погляд, яны нагадваюць малюнкі Сент-Экзюпеcontainers да "Маленькага прынца".

А вось тэхнічных распрацовак у галіне беларускай кнігі, на жаль, амаль што няма. Прадчуваем пярэчанне: "А як жа выданні "Белфакса"? Гэтае выдавецтва абапіраецца на існуючыя замежныя выданні і распрацоўкі замежных дызайнераў. Таму свет цацак, перыскоп ці агучванне падарожжа ў джунглі — гэта цудоўна, але не зусім нашы. У выдавецтве "Юнацтва" ў ранейшыя часы рабіліся спробы стварыць беларускую кніжку-цацку, кніжку-каляндар або шырму, раскраску, красворды. Дзецям надзвычай падабаліся серыі "Зрабі сам", "Эўрыка", "Знайка" і кнігі-цацкі, такія як "Карусель", "Беларускія музыкі" і інш. Былі сярод іх і аэробусы, робаты, дырыжаблі, самалёты. Але сёння амаль усё гэта ў мінулым.

Многія кнігі, выдадзеныя ў Беларусі, выкананы ў тэхніцы высокага друку ў чорна-белым колеры. Рабіць каляровыя кніжкі і выдаваць іх вельмі складана. Выключэнні рэдкія. Так, можна згадаць "Міколку-паравоза" М.Лынькова (выдавецтва "Юнацтва"). Часцей маляўнічыя ілюстрацыі проста ўклейваюцца ў кнігу (так званыя ўклейкі і накладкі). Кнігі змяшчаюцца ў зручны, але не вельмі даўгавечны цэлафаніраваны пераплёт. Большасць кніжак у Беларусі выдаюцца афсетным друкам.

Мастацкае афармленне кнігі падпарадкавана яе структуры. Застаўкі, шмуцтытулы, розныя лінейкі і віньеткі — неабходныя дэталі яе ўбрання. Яны састаўляючыя кнігі: раздзяляюць ці надаюць большую значнасць раздзелам, засяроджваюць увагу чытача. Як будзе выглядаць кніга, сумесна вырашаюць мастацкі рэдактар і прафесійны мастак. Добра зробленая кніга — гэта аптымальна знойдзены варыянт адпаведнасці яе формы і зместу. Кожная кніга павінна мець сваё адметнае афармленне. Калі ствараецца канцэпцыя кнігі, ставіцца мэта вытрымаць адзіныя дух і стыль будучага выдання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя таго, кніга павінна лёгка чытацца, мець "многа паветра".

Прыватныя выдавецтвы, чыя прадукцыя запаланіла кніжныя прылаўкі, значна ўступаюць ва ўзроўні мастацкага афармлення дзяржаўным. У большасці з іх працуюць мастакі, якія не з'яўляюцца прафесіяналамі у сферы кнігі.

Самыя ўдалыя, на наш погляд, выданні апошняга часу — гэта "Песня пра зубра" М.Гусоўскага (мастак Ул.Савіч), "Тарас на Парнасе" (мастак У.Гладкевіч), "Журавель і чапля" М.Танка (мастак В.Славук), "Гарады Беларусі на старых паштоўках" В.Целеша (мастак А.Цароў), "Пан Тадэвуш" А.Міцкевіча (мастак В.Шаранговіч), а таксама "Нацыянальны дызайн-цэнтр", "Іканапіс Беларусі XV—XVIII стст.", "Веткаўскі музей народнай творчасці" і інш.

**С.Л.Бухель,**
*суіскальнік кафедры*
*бібліяграфіі і дакументазнаўства*

## ВЫДАВЕЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МЕТАДЫЧНЫХ ЦЭНТРАЎ ЯК СРОДАК ІНФАРМАЦЫЙНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ КУЛЬТУРНА-АДПАЧЫНКАВАЙ СФЕРЫ

*(на прыкладзе Магілёўскага АНМЦ)*

Рэдакцыйна-выдавецкая дзейнасць — адзін з напрамкаў работы навукова-метадычнага цэнтра (НМЦ). Сёння гэты кірунак работы НМЦ найбольш актуальны, што вызначаецца глабальнай інфарматызацыяй і развіццём сучасных інфармацыйных тэхналогій, без якіх немагчыма нармальная прафесійная дзейнасць. Больш таго, у культурна-адпачынкавай сферы (КАС) інфармацыйная дзейнасць і творчая актыўнасць работнікаў культурна-адпачынкавай сферы і рэкрэацыйных работнікаў знаходзяцца ў непасрэднай залежнасці. Але, як ні



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ